выкладаў у Бел. тэатр.-маст. ін-це. Працаваў у розных жанрах станковага жывапісу. Яго творчасці ўласцівы выразнасць вобразаў, яснасць кампазіцыйных рашэнняў. Сярод твораў: «Пойма ракі Бярэзіны» (1953), «Пасля працы» (1954), «Гарманіст ідзе» (1955), «У Белавежскай пушчы. Зубры» (1960), «Трывога» (1961), «1941 год» (1967), «Над Прыпяццю» (1973), «Возера Мураці» (1975), партрэты і інш.

**ДАРАШЭВІЧ** Энгельс Канстанцінавіч (н. 26.10.1931, Мінск), беларускі філосаф, культуролаг. Д-р філас. навук (1984), праф. (1992). Скончыў



*Э.К.Дарашэвіч.*

БДУ (1953). З 1958 у Ін-це філасофіі і права, з 1990 у Ін-це сацыялогіі НАН Беларусі. З 2000 у Бел. дзярж. ун-це культуры і мастацтваў. Навук. работы па гісторыі эстэтычнай думкі, філасофіі і педагогіцы Беларусі, праблемах культуралогіі, этнічнай самасвядомасці, міжнац. адносін. Дзярж. прэмія Беларусі 1984.

*Тв.:* Аниол Довгирд — мыслитель эпохи Просвещения. Минск, 1967; Философия эпохи Просвещения в Белоруссии. Минск, 1971; Очерк истории эстетической мысли Белоруссии. М., 1972 (разам з У.М.Конанам); Культурная спадчына: культуралагічна-сац. даследаванне. Мінск, 2001 (у суаўт.); Символы в контексте культуры. Вып. 1—3. Мінск, 2001—2002 (у суаўт.); Философская и социальная мысль Беларуси эпохи Просвещения. Гродно, 2010.

**ДАРБІ́СТЫ**, евангельскія хрысціяне дарбісты, плімуцкія браты, рэлігійная група пратэстанцкай накіраванасці. Створана ў 1820—30-я гг. ў г. Плімут (Вялікабрытанія) прапаведнікам Д.Н.Дарбі (назва ад яго імя) як абшчына, апазіцыйная афіц. англіканскай царкве. Веравучэннем блізкія да баптыстаў і евангельскіх хрысціян. Вялі прапаганду сярод хрысціян і іудзеяў. Д. адмаўляюць духавенства як асобную прафес. групу і надаюць вял. значэнне асабістаму тлумачэнню Бібліі. Найб. распаўсюджаны ў Вялікабрытаніі і яе б. калоніях і дамініёнах, Зах. Еўропе. У пач. 20 ст. з'явіліся ў Беларусі (Мінск). У 1920—30-я гг. ў Зах. Беларусі склаліся цэнтры Д. у Брэсце, Кобрыне, Пінску, якія праводзілі місіянерскую работу сярод мясц. сялян, а таксама яўрэяў. Пасля Вял. Айч. вайны дзейнасць Д. у Беларусі заняпала.

*Б.Т.Камейша.*

**ДАРВІШАЎ** Віктар Андрэевіч (2.11.1897, г. Прылукі, Украіна — 12.10.1951), расійскі і беларускі рэжысёр. Працаваў у тэатрах Расіі. У 1933—38 маст. кіраўнік Бел. другога дзярж. тэатра. У тэатры імкнуўся спалучаць у творчасці тагачасную сав. драматургію з нац. драматургіяй і рус. класікай. Сярод пастановак: «Чалавек вырашае» Д.Курдзіна, «Байцы» Б.Рамашова (абедзве 1934), «Беспасажніца» А.Астроўскага, «Любоў Яравая» К.Транёва (абедзве 1936), «Банкір» А.Карнейчука, «Вайна вайне» і «У пушчах Палесся» Я.Коласа (усе 1937). Выступаў у перыяд. друку з артыкуламі, прысвечанымі тэатру.

**ДАРКЕ́ВІЧ** Пётр Яўгенавіч (1898, в. Міхалава Смаленскай вобл., Расія — 4.11.1937), беларускі гісторык мастацтва. Скончыў Маскоўскі ўн-т. З 1927 выкладаў у Віцебску ў маст. тэхнікуме (1927—37), з 1932 адначасова ў кінатэхнікуме (1932—37), пед. ін-це. Даследаваў праблемы тэорыі і гісторыі мастацтва. У 1937 рэпрэсіраваны. Рэабілітаваны ў 1957.

**ДАРО́ЖКА**, снасць для лоўлі драпежнай рыбы. Прадаўгаватая металічная пласціна з кручком або якарком на канцы, прымацаваная да доўгага шнура, які цягнуць за чоўнам ці лодкай. Часам Д. закідваюць з берага. Злавіўшы рыбу, яе падцягваюць, намотваючы шнур на спец. калаўроцік або дошчачку. На тэр. Беларусі Д. вядома са старажытнасці, у наш час выкарыстоўваецца рыбаловамі-аматарамі.

**«ДАРО́ЖКА»**, беларускі традыцыйны гуртавы танец, блізкі да карагодаў шарэнгавага тыпу («Проса», «Баяры»). Муз. памер 2/4, структура 6-тактавая, тэмп умераны. Існуе пераважна па-за абрадам, але часам выконваўся на Вялікдзень і на вяселлях. Мае варыянты ў назвах, кампазіцыі і пластыцы. Зафіксаваны ў паўн.-зах. р-нах Міншчыны і памежных р-нах Віцебскай і Гродзенскай абласцей з назвамі «Падарожны», «Дарожная». На Магілёўшчыне ў лакальнай традыцыі (Бялыніцкі р-н) бытуе аднатыпны танц. карагод з назвай «Вабівана дарожка» («танцавалі ў маразы»), якому ўласцівыя 8-тактавая муз. і харэагр. структура і падкрэсленае, з лёгкім прыбіваннем, выкананне крокаў. Аснову кампазіцыйных варыянтаў утвараюць пачарговае ці адначасовае прасоўванне шарэнг насустрач адна адной, разыходжанне іх у розныя бакі, пераходы (змена месцаў), павароты ў пары. Сустракаецца рух парамі па коле, зафіксавана фігура «Ручаёк», якую танцоры пастаянна прасоўваюць наперад, рухаючыся з «хваста» ў «галаву» калоны. Асн. рухі — роўны, аднарытмічны крок, трохкрок, нескладаныя прытупы. У канцы 1940-х гг. у Смаргонскім аматарскім харэагр. калектыве балетмайстрам Я.Хаціloўскім на падставе аўтэнтычнага ўзору «Д.» быў створаны яе стылізаваны варыянт.

*Літ.:* Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 тамах. Т. 1. Магілёўскае Падняпроўе. Мінск, 2001. М.А.Козенка.

**ДАРО́ЖНЫ** (сапр. С е р а д а) Сяргей Міхайлавіч (25.2.1909, г. Слонім — 19.7.1943), беларускі паэт. Скончыў БДУ (1930). Працаваў у рэдакцыях рэсп. газет і часопісаў. Аўтар

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКИ